• студзень • 2012 •

MAKAsIN

# СКАРАЧАЦЬ НАВУЧАНЬНЕ ДА 4 ГАДОЎ БУДУЦЬ ЗА КОШТ ГУМАНІТАРНЫХ ДЫСЦЫПЛІНАЎ

***Ужо цяпер 15 % спэцыяльнасьцяў беларускіх ВНУ можна прайсьці за чатыры гады. З наступнага году працягласьць навучаньня скароцяць яшчэ на некаторых катэдрах, пераважна, за кошт гуманітарных дысцыплінаў.***

**П**рацягласьць навучаньня ў беларускіх унівэрсытэтах зь пяці да чатырох гадоў будуць скарачаць *«шляхам зьмястоўнай аптымізацыі сацыяльна-гуманітарнага кампанэнту»*, – заявіў рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы (РІВШ) Міхаіл Дзямчук.

Па словах прафэсара Дзямчука, гуманітарныя дысцыпліны ў беларускіх ВНУ праходзяць у якасьці кампэнсацыі за адсутнасьць 12-а ці 13-а клясу ў школах, як ёсьць у многіх эўрапейскіх краінах.

А паколькі Беларусь зьбіраецца далучыцца да агульнаадукацыйнай прасторы Эўропы, дзе на атрыманьне першай ступені вышэйшай адукацыі прынята традыцыя 4 гады, то працягласьць навучаньня ў нашых ВНУ якраз і скароцяць за кошт гуманітарных прадметаў. Праўда, кампэнсаваць іх у школе, здаецца, не зьбіраюцца.

Цяпер разглядаюцца розныя варыянты, але адмова ад такіх прадметаў як гісторыя ці паліталёгія выглядае найбольш верагоднай: гуманітарныя дысцыпліны якраз складаюць пятую частку пяцігадовай праграмы, якую на пятую ж частку і трэба скараціць.

*«Задача па скарачэньні тэрмінаў падрыхтоўкі спэцыялістаў з вышэйшай адукацыяй была пастаўлена і кіраўніком дзяржавы»*, – кажа Дзямчук. Па ягоных словах, ужо з 2006 году 15 % спэцыяльнасьцяў беларускіх ВНУ – чатырохгадовыя.

І грошай зэканомяць…

Між тым яшчэ адным матывам скарачэньня працягласьці навучальных праграмаў могуць быць праблемы зь фінансаваньнем адукацыі. Увосень 2011 году Міністэрства адукацыі абвясьціла аб плянах скарачэньня выдаткаў за кошт зьменаў навучальных плянаў, двухразовага скарачэньня набору на спэцыяльнасьці і скарачэньня пэрсаналу. Такім чынам плянуецца зэканоміць 12.7 мільярды рублёў.

А яшчэ адным ударам па гуманітарным дысцыплінам можа стаць рашэньне зьнізіць значнасьць моўных тэстаў пры залічэньні ў ВНУ. Адбудзецца гэта за кошт павялічэньня ў два разы вагі балаў па профільных прадметах у агульнай суме пры паступленьні на тэхнічныя спэцыяльнасьці.

***Па матэрыялах generation.by***



# INFO

• 1 февраля политзаключенный Владимир Бондаренко, которому отказано в УДО, несмотря на тяжелое состояние здоровья, написал прошение.

• Бывший председатель Партии БНФ Левон Борщевский и сопредседатель оргкомитета по созданию партии «Белорусская христианская демократия» Павел Северинец однозначно высказываются за бойкот.

• В районе Шабаны в Минске насмерть замерз 17-летний учащийся Машиностроительного колледжа.

• Минчанин выдавал себя за сотрудника Следственного комитета Беларуси и вымогал у людей деньги.

• В Минске в районе Немиги появились растяжки «Свободу Лобову!» и «Свободу Дашкевичу!».

• Белорусский ПЕН-центр отправил в Стокгольм письмо с предложением номинировать Владимира Некляева на Нобелевскую премию по литературе.

• Белорусские представительства за рубежом призывают усилить санкции против режима диктатуры в Беларуси.

• В Минске законодательно определен перечень мест, где человек может дышать чистым от табака воздухом, а курильщик – получить серьезный штраф.

• Просветительское учреждение «Центр правовой трансформации» (ЦПТ) направило официальное письмо в латвийское посольство, в котором призвали госсекретаря Латвии посетить в Минске политзаключенных.

• Адвокатам кандидата в президенты Андрея Санникова отказано в обжаловании приговора, вынесенного политзаключенному судом Партизанского района Минска.

• Официальная безработица в Беларуси на конец декабря 2011 года составляла 0,6 % – едва ли не самый низкий показатель в Европе.

*www.charter97.org*

## ВІЗЫТ У БРУСЭЛЬ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ЭКСПЭРТАЎ У ГАЛІНЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

***Асьветніцкая ўстанова «Офіс эўрапейскай экспэртызы й камунікацыяў» (Менск, Беларусь) арганізуе паездку ў Брусэль (Бельгія) для беларускіх спэцыялістаў у галіне вышэйшай адукацыі па праграме: «Эўразьвяз і Беларусь: дзелімся досьведам».***

Падчас візыту беларускія спэцыялісты атрымаюць магчымасьць наладзіць кантакты з калегамі зь вядучых ВНУ Бельгіі, сустрэцца са спэцыялістамі, якія займаюцца пытаньнямі супрацоўніцтва зь Беларусьсю ў Эўрапейскай камісіі, Зьнешнепалітычнай дыпляматычнай службе ЭЗ, а таксама ўзяць удзел у круглым стале, прысьвечаным Балёнскаму працэсу. Паездка мае адбыцца ў сакавіку 2012 году.

Да ўдзелу запрашаюцца прадстаўнікі грамадзкіх арганізацыяў, якія займаюцца пытаньнямі вышэйшай адукацыі, навукоўцы й дасьледчыкі, выкладчыкі ВНУ.

Арганізатары кампэнсуюць выдаткі на праезд, консульскі збор за візы, страхоўку й пражываньне.

Апошні тэрмін падачы заявак: 18 лютага 2012 году.

Падрабязная інфармацыя пра праграму – на сайце: http://by.democraticbelarus.eu/node/2345

***Паводле рассылкі belngo.info***

## НАЗІРАНЬНЕ Ў СЛАВАКІІ: НАБОР ДАСЬВЕДЧАНЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ

***Удзельнікі ранейшых этапаў праекту «Назіраньне за выбарамі: тэорыя й практыка» запрашаюцца на падачу заяўкі на пазыцыю назіральніка падчас парлямэнцкіх выбараў у Славакіі 10 сакавіка 2012 году.***

Даты місіі: 7–13 сакавіка 2012 году. Адбор ажыцьцяўляецца на конкурснай аснове.

Немагчыма стаць удзельнікам місіі ў Славакію, калі вы прымалі ўдзел у 2-х апошніх місіях праекту «Назіраньне за выбарамі: тэорыя й практыка» запар.

Каб узяць удзел, неабходна запоўніць ан-ляйн заяўку, якая знаходзіца па спасылцы: http://bit.ly/zmFa4F

Апошні тэрмін падачы заявак: 7 лютага 2012 году.

Па ўсіх пытаньнях наконт удзелу зьвяртайцеся праз электронную пошту: eotp@eotp.info

***Паводле eotp.info***

## ВІДЭА АРТ ФЭСТЫВАЛЬ «CROSSTALK 2012»

***Фэстываль быў заснаваны ў 2006 годзе, і з таго часу прадстаўляе новыя мастацкія відэа-працы з усіх частак сьвету. Праграма фэстывалю таксама ўключае ў сябе лекцыі й майстар-клясы артыстаў. Фэстываль пройдзе 7–10 чэрвеня 2012 году ў Будапэшце (Вугоршчына).***

Удзельнікі маюць права прадстаўляць на конкурс да 3-х відэа. Па тэме работы абмежаваньняў няма.

Азначаныя працы павінны адпавядаць наступным патрабаваньням:

– быць зьнятымі пасьля 1 студзеня 2009;

– не перавышаць працягласьць 15 хвілінаў.

Падрабязная інфармацыя пра ўмовы ўдзелу, патрабаваньні да запаўненьня анкеты – на сайце: http://www.adukacyja.info/news/contests/314-crosstalk-video-art-festival-2012.html

Апошні тэрмін падачы заявак: 30 сакавіка 2012 году.

***Паводле adukacyja.info***

**Паводле рассылкі Асамблеі НДА belngo.info**

## Война вокруг авторских прав: над сайтами с «пиратским» контентом сгущаются тучи

***Специалисты по технологиям предупреждают, что сайты, позволяющие пользователям хранить в интернете объемные файлы, могут быть в скором времени привлечены к ответственности. Об этом пишут международные СМИ.***

**К**ак сообщает The Times, правовые акты по закрытию файлообменника Megaupload.com, сделавшего своих основателей миллионерами, свидетельствуют о том, что сайты, предоставляющие аналогичные услуги, рискуют предстать перед правосудием за нарушение авторских прав.

Между тем российский министр связи и массовых коммуникаций Игорь Щеголев подверг критике скандальный американский законопроект по борьбе с пиратством SOPA и предложил ввести международный «кодекс поведения» в интернете.

Газета The Washington Times сообщает также о том, что Верховный суд США в прошлую среду «объявил преступлением исполнение без разрешения музыки русского композитора, умершего 58 лет назад». В результате постановления номер 6–2 работы Сергея Прокофьева перестали быть всеобщим достоянием, и оркестрам, официально исполнявшим его музыку бесплатно, придется выплачивать весомые отчисления.

## Безумная идея в Лондоне: «Реставрационные работы слишком дороги, продадим Вестминстер русским»

***«Как бы невероятно это ни звучало, но британское правительство рассматривает идею продажи здания британского парламента, включая Биг-Бен – башню с часами, которая является символом Лондона, да и всей Великобритании. Причина? Как обычно, деньги: комиссия экспертов выяснила, что готический дворец медленно разрушается. Реставрация, по предварительным оценкам, обойдется почти в миллиард фунтов стерлингов (1 млрд 150 тыс евро): это неподъемные расходы, особенно в период экономического кризиса.», – пишет издание La Repubblica.***

*«**П**о словам представителя Палаты общин, правительство рассматривает вариант продажи всего комплекса зданий, к примеру, китайскому миллиардеру или главе какой-нибудь российской нефтяной компании, чтобы они, быть может, превратили его в свое жилище. Это дорого: стоимость Вестминстера оценивается в миллиард фунтов плюс такая же сумма требуется на реставрацию. За 500 млн фунтов можно было бы приобрести новое здание парламента, остальные 500 млн – направить в государственную казну»*, – говорится в статье.

## Обама пытался начать тайные переговоры с Ираном?

***Утверждают, что президент США направил конфиденциальное письмо аятолле. Белый дом выступил с опровержением***



**В** Вашингтоне отрицают существование «секретного письма», в котором президент США Барак Обама якобы предложил иранскому аятолле Али Хаменеи провести прямые переговоры с целью предотвратить блокирование Ормузского пролива. Ранее такая информация поступила от иранского информационного агентства «Фарс» со ссылкой на парламентария-консерватора Али Мотахари и была подтверждена официальным представителем иранского МИДа.

В январе высокий чин из Корпуса стражей исламской революции сообщил, что решение перекрыть Ормузский пролив, если экспорт иранской нефти будет прекращен, исходит от «высших официальных лиц» республики.

Сообщается, что послы стран Евросоюза запланировали на четверг рассмотрение вопроса о санкциях против Ирана. Министр иностранных дел Исламской республики Али Акбар Салехи заявил, что площадкой для дальнейших переговоров по ядерной программе может стать Стамбул. По его словам, Турция контактирует как с Ираном, так и с европейскими официальными лицами. Даты переговоров Салехи не назвал.

## Путешествия на Марс и долголетие – открытия ближайших 50 лет

***Мы будем есть мясо, не убивая животных и не загрязняя окружающую среду, прогнозирует Риккардо Луна в материале, напечатанном в газете La Repubblica.***

*«**Ч**ерез 50 лет мы будем жить лучше. Мы будем ездить на автомобилях, работающих на солнечной энергии, и есть мясо, произведенное в лаборатории, без убийства животных. Мы будем брать энергию, которая нам нужна, из центра Земли, и распрощаемся наконец с газом и нефтью»*, – пишет издание.

Какой будет наша жизнь в 2062 году? Биньями уверен: *«Уже родился ребенок, который будет гулять по Марсу»*. Потому что планы покорения Марса разработаны уже давно.

К 2062 году большую часть работы вместо человека будут выполнять молекулярные конструкторы, рисует будущее собеседник издания, а продолжительность жизни человека значительно увеличится. *«В 2062 году родится ребенок, который будет жить 152 года»*, – уверен итальянский ученый.

По материалам inopressa.ru, newsru.com

# ПОЛИТИЧЕСКАЯ РЕФОРМА: ВАМ НЕ ПОСЛЫШАЛОСЬ!

***В Беларуси словосочетание «политическая реформа» из уст обычного среднестатистического гражданина звучит угрожающе. Если «памяркоўны беларус» знает такие слова, то вовсе он не памяркоўны, и вовсе не белорус, а, скорее всего, какой-то западный антиправительственный засланец. А вот, если речь о политических реформах держит глава государства, то здесь уже расклад совсем иной: это как бальзам на душу, как валерьянка от излишнего беспокойства, как сказка на ночь.***

**В** ком именно поддерживал мечту о демократии А. Г. Лукашенко на прошедшей неделе, так и осталось загадкой. Граждане РБ слова Президента в интервью китайским журналистам о грядущей политической реформе, скорее всего, пропустили мимо ушей либо улыбнулись про себя, эксперты побурчали в интернете дескать, что это все пустые обещания, а китайцы…а что китайцы? Для них маленькая стабильная Беларусь – это, в первую очередь, экспортный рынок. Есть ли демократия в Беларуси – для нас вопрос риторический, а китайские собратья подобными вопросами, пожалуй, и не задаются вовсе.

Тем не менее, фраза Президента *«Проведем парламентские выборы, и, думаю, что нам надо обратить серьезное внимание на политическую реформу, или реформу политической системы нашей страны»* не осталась незамеченной. Но бури негодования или стихийной радости по поводу сказанного не наблюдалось. Эксперты напомнили, что в новый 2011 год мы входили под лозунгом всеобщей либерализации, а потому реальность планируемых реформ оценили скептично, обратив внимание интересующихся граждан на то, что речь идет о гипотетической ситуации, которая случится еще ой как не скоро. Как минимум лет через пять, когда непотопляемую Беларусь уже демократической волной накроет ближайшая парламентская кампания. Сентябрьские парламентские выборы Президент планирует провести без изменений, шутить с президентскими выборами, А. Г. Лукашенко не рискнет, Выборы в Национальное собрание – без комментариев. После изменения Конституции в 1996 году все политические возможности депутатов превратились в политические «невозможности». Таким образом, руководство Беларуси, как говорится, торопиться будет медленно.




Нельзя не обратить внимания и на контекст, в котором было сделано заявление: интервью китайцам с надеждой на китайский же опыт. Кроме того, сам А. Г. Лукашенко уточнил, что Беларусь должна реагировать на изменения, происходящие в мире, в том числе и на «арабскую революцию». С другой стороны, радикальная смена политического курса не позволит действующему Президенту удержать свою власть, да и сам Лукашенко навряд ли готов к какой-либо серьезной политической модернизации: слишком уж привычен и удобен сложившийся стиль управления.

Одной из причин внезапно появившегося курса на модернизацию, эксперты называют и падение электорального рейтинга Лукашенко. Электорат медленно, но верно, перерастает ставшую такой привычной политическую картинку Беларуси. Число сторонников действующего Президента среди «люда» неумолимо сокращается. С учетом того, что вся власть, в принципе, держалась исключительно на харизме Лукашенко и на популизме, подобные явления – показатель будущей катастрофы. Вполне логично возникновение острой необходимости в новой политической приманке. Как-никак, а в 2011 году в либерализацию поверили. Авось и на этот раз мифический сыр тоже сойдет за настоящий.

Собственную версию словесной демократии Президента выдвинул и лидер Объединенной гражданской партии (ОГП) Анатолий Лебедько. Он считает, что Лукашенко подобные заявления сделал лишь для того, чтобы не выглядеть белой вороной на фоне Путина и Медведева. По словам Лебедько *«люди слышат, что в России проходит какая-то либерализация, присутствуют элементы диалога, поэтому Лукашенко преломляет российскую ситуацию на белорусскую словесную действительность»*.

В целом, независимые эксперты, несмотря на разногласия в оценке причин, побудивших Лукашенко пообещать политическую модернизацию, сходятся в одном: если что-то и будет, то только имитация. К сожалению, именно эта экспертная оценка больше всего и похожа на правду. Реальных действий, хоть как-то указывающих на смену политического курса как не было, так и нет. Очередной отказ в регистрации Белорусским христианским демократам, наличие в стране, как ни крути, а все-таки политических заключенных, открытое давление на независимые общественные организации. На фоне этих событий, любые обещания демократии, даже неизвестно когда и неизвестно какой демократии, звучат фальшиво и вовсе не похожи на волшебную сказку на ночь.

***А. Пешков***

# ФАСТ-ФУД НАСТУПАЕТ

***Любимое лакомство детей, а также многих студентов – фаст-фуд во всех его самых вредных проявлениях. Быстро и дешево. К тому же, находясь в университете целый день, попасть в столовую даже при большом желании весьма затруднительно – эти очереди на переменах и часы работы! А вот буфет открыт всегда и в нем всегда найдется для нас горячая пицца или хот-дог.***

Хот-дог завоевал не только пгушных студентов, но поистине весь мир. Хот-дог стал национальным американским блюдом, а Нью-Йорк без него просто невозможно представить. Так, считается, что в Нью-Йорке нет ни одного заведения, где бы нельзя было съесть горячую булочку с сосиской. Американцы даже отмечают Национальный день хот-дога – 18 июля, а члены совета любителей хот-дога и сосисок проводят соревнования по искусству приготовления хот-догов, провозглашая 4 основных правила:

*• Лицам, старше 18 лет, не разрешается поливать хот-дог кетчупом;*

*• Хот-дог в сдобной булочке нельзя есть с тарелки, а только руками;*

*• Приправу, остающуюся на руках, нельзя смывать, нужно облизать пальцы;*

*• Ни в коем случае нельзя класть хот-дог на изящную фарфоровую посуду, это просто несовместимо с понятием «хот-дог – национальная американская пища».*

История хот-дога началась с одного франкфуртского мясника, занимавшегося производством колбасок. В 1871 мясник начал продавать свою колбасу обернутой в ломтики хлеба. Его продажи стали настолько успешными, что за год мяснику удалось продать 3684 колбаски. С тех пор данное блюдо стало очень популярным. В 1901 вместо неудобных ломтиков хлеба начали использовать булки, в средину которых аккуратно вкладывали сосиски. А в начале XIX века секрет приготовления таких сосисок в Америку привезли немецкие иммигранты.

В результате хот-дог стал настолько популярным в Америке, что каждый штат придумал свой рецепт приготовления хот-дога. Например, на юге США делают кукурузные хот-доги, в Канзасе в хот-доги добавляют квашеную капусту и тертый сыр, а в Чикаго готовят яблочные и крабовые хот-доги. Давая волю фантазии и стремясь удовлетворить запросы покупателей, производители хот-догов заменили привычные кетчуп и горчицу на майонез на основе васаби и авокадо. Некоторые предлагают попробовать хот-дог с арахисовым маслом и фуа-гра. Существуют хот-доги с пюре из турецкого гороха, огурцами и оливками, или с авокадо, помидорами, майонезом васаби и чипсами.

Объём сосисочного рынка США оценивается в 1,7 млрд долларов США. Возможно, именно поэтому, хот-договая эпопея в Америке только набирает обороты, нисколько не сбавляя их. Так, в 1994 году даже был создан Национальный совет по хот-догам и сосискам, который дегустирует хот-доги, изучает качество продукции и рекламирует ее. Ежегодно 4 июля, в День Независимости США, на нью-йоркском полуострове Кони-Айленд проходит чемпионат мира по скоростному поеданию хот-догов. На чемпионате мира 2011 года победителем в очередной раз стал житель Калифорнии Джой Честнат по прозвищу «Челюсти». За десять отведенных регламентом минут ему удалось съесть 62 булочки с сосиской.

А вот самый большой хот-дог в мире недавно приготовили парагвайские повара. Длина бутерброда с сосиской, приготовленного на специальной газовой плите, составила 203,8 метра, а вес – 265 килограммов. Чтобы приготовить гигантское блюдо, понадобилось 245 поваров. После приготовления хот-дога более двух тысяч посетителей выставки смогли его бесплатно попробовать.

Несмотря на то, что хот-дог стал культовой едой и приносит немалую прибыль производителям и американскому бюджету, врачи в унисон утверждают, что такая еда вредна для органов пищеварения, поскольку это несбалансированная пища. Согласно докладу Американского института по исследованию рака, хот-дог так же опасен для здоровья, как и сигареты. Кроме канцерогенов, эта еда содержит повышенное количество соли, которое способствует развитию гипертонии и заболеваний сердечно-сосудистой системы. Врачи считают, что хот-доги нужно продавать с такими же предупреждающими надписями, как и сигареты.

Так что, товарищи-студенты, начиная новый семестр, серьезно подумайте о своем питании. Если Министерство образования еще не запретило есть хот-доги в общественных местах, как, например, курить, это вовсе не значит, что фаст-фуд не вреден.

***Ученый братец-кролик***
***По материалам Интернет***

# БЕЛТА: АБМЕЖАВАЦЬ СВАБОДНЫ ДОСТУП У ІНТЭРНЭТ ХОЧУЦЬ САМІ ЯГО КАРЫСТАЛЬНІКІ

***Дзяржаўная інфармацыйная агенцыя БелТА піша пра тое, што свабодны доступ у інтэрнэт павінен быць абмежаваны, спасылаючыся на нібыта жаданьне саміх інтэрнэт-карыстальнікаў.***

Загаловак аб выніках сацыялягічнага апытаньня беларускіх карыстальнікаў інтэрнэта, зробленага ў сьнежні праз тэлефонны абзвон 1 тысячы чалавек, інфармацыйная агенцыя друкуе такім чынам, што неабходнасьць абмежаваньня свабоднага доступу ў Інтэрнэт выглядае бясспрэчнай.

Мець свабодны доступ да ўсіх сайтаў незалежна ад іх зьместу жадае па выніках апытаньня праведзенага Інфармацыйна-аналітычным Цэнтрам пра адміністрацыі А. Лукашэнкі толькі 5 % карыстальнікаў Сеціва.

Карыстальнікі інтэрнэту, якіх адшукалі па тэлефоне сацыёлагі ІАЦ, жадаюць абмежаваццца перш за ўсё ад эратычных і парнаграфічных сайтаў. Крыху ніжэй у рэйтынгу апынуліся сайты таямнічых тэрарыстычных арганізацыяў і зь інфармацыяй «экстрэмісцкага зьместу».

***Па матэрыялах Generation.by***

# О ЧЕМ НЕ ЗНАЮТ УЧЕНЫЕ

***Очередная сессия закончилась. Очередная сессия закончилась. Очередная сессия закончилась. Согласитесь, приятно читать эти строчки :) Надеюсь, что сессия закончилась для вас успешно, да по-другому и не может быть! А если все-таки где-то что-то не очень получилось, то не расстраивайтесь и не унывайте. Поверьте, даже великие ученые мужи мира знают далеко не всё.***

**Н**апример, ученые до сих пор не знают, зачем человеку ноздри. К такому выводу пришли ученые из калифорнийского университета в Мичигане, заметьте, после длительных исследований. Дело в том, что дыхательная система способна функционировать путем поглощения кислорода сквозь ротовую полость, и явной необходимости в ноздрях нет. К решению подобной проблемы ученые решили подойти скрупулезно, после нескольких сенсационных открытий в сфере биогномики человека. Подобное исследование послужило продолжением недавней работы, на тему: «Зачем человеку волосы в ноздрях?!».

Да черт с ними с ноздрями! Если



они есть и функционируют, значит, для чего-то они все-таки нужны. Сложнее дело обстоит с человеческими эмоциями. Так, некоторые из них попали в список научных загадок, происхождение которых ученые до сих пор не могут до конца объяснить. Начиная статью фразой «Нет ничего загадочнее, чем мы сами», авторы статьи начинают свой рейтинг с такого явления, как смущение. Попытки объяснить, почему мы краснеем, когда попадаем в неловкую ситуацию, предпринимал еще Чарльз Дарвин, но до сих пор точного ответа на этот вопрос не существует. По мнению некоторых, краска в лице помогает сгладить неровности общения и побуждает некоторую интимность, являясь сигналом слабости.

Осталась неразгаданной и тайна смеха. Причем самого обычного, а вовсе не «загадочного смеха». Проведенные исследования так и не смогли определить, что именно побуждает людей смеяться, так как порой самые банальные комментарии вызывают больше положительных эмоций, чем шутки.

Великое таинство поцелуев еще долго останется великим таинством. Почему мы целуемся, ученые тоже не могут объяснить (а может и не надо?). Возможно, поцелуи возникают как память о кормлении грудью, а древние люди выкармливали своих отпрысков и вовсе рот в рот. Таким образом, возможно, и возникла связь между ощущением чужой слюны и удовольствием.

Ломают голову ученые и над сновидениями, изучением которых посвятил свою жизнь Зигмунд Фрейд. Однако его теория о подсознании, воплощенном во снах, была широко раскритикована, а ученые обнаружили, что сны помогают нам справиться с эмоциями. И все же никто не смог ответить на вопрос, почему мы порой видим странные видения, когда спим.

Неразгаданными остаются также суеверия, «переходный возраст», альтруизм, чесание в носу, рост волос на теле и искусство.

Но, пожалуй, одним из самых интригующих остается «эффект душевой занавески», которая непонятным образом притягивается к воде и липнет к телу человека, принимающего душ. Вот основные теории, выдвинутые физиками:

**1. «Эффект плавучести».** Из-за того, что горячая вода нагревает воздух, давление воздуха за занавеской понижается по сравнению с давлением снаружи, заставляя занавеску втягиваться. Это, впрочем, не объясняет, почему «эффект душевой занавески» сохраняется, если вы принимаете холодный душ.

**2. «Эффект Бернулли».** Основан на принципе полёта самолёта, то есть ускорение жидкости, летящей вниз, снижает давление и «тянет» воздух снаружи для компенсации разницы, заставляя занавеску «всасываться».

**3. «Теория горизонтального вихря».** С помощью дорогостоящих компьютерных программ, Дэвид Шмидт из Scientific American обнаружил, что брызги воды создают вихрь, который ведёт себя, как центр циклона, вращающегося перпендикулярно занавеске, что и притягивает её. За это открытие Дэвид получил Шнобелевскую премию.

Ну что, очередной хвост после сессии все еще кажется проблемой? Тогда может пора взяться за серьезные научные открытия? Например, разгадать «эффект душевой занавески» – новичкам везет всегда и всюду – и тогда станет не важным любой сессионный хвост. Ведь вы разгадаете то, над чем ломали голову десятки ученых по всему миру!

*Ляля Цветочная*
*По материалам Интернет*

# «СВЯТОЕ КШЧЭННЕ ВАДУ КСЦІЛА… СВЕТ АЧЫСЦІЛА І ВАДУ НАВЕРХ ПУСЦІЛА»

***Вадохрышча (Хрышчэнне, Кшчэнне, Богаяўленне) – апошняе свята калядного цыклу. Гэта быў дзень завяршэння Калядаў (19 студзеня н. ст.).***

**Х**рысціянская рэлігія звязвае Вадохрышча з хрышчэннем Ісуса Хрыста Іаанам Хрысціцелем на рацэ Ярдані са з'яўленнем усіх асобаў Святой Тройцы. На Вадохрышча ў храмах адбываецца асвячэнне вады, якую некалі бралі з бліжэйшага вадаёма (у гэты дзень усе вадасвятныя месцы называліся ***«Ярданямі»***).

Пры асвячэнні вады на Усходнім Палессі ставілі кругом маладыя ялінкі, каб закрыць святую ваду ад усялякае нечысці, а іх галінкі потым падкладвалі пад «курэй-квахтух», каб было болей куранят, ці ўторквалі ў страху, каб туды не ўдарыў пярун. Ліхіх духаў на «Ярдані» адпужвалі таксама стральбою з ружжаў.

Яшчэ з дахрысціянскіх часоў верылі ў **цудадзейную моц асвечанай вады**, захоўваючы ў доме, як і асвечаныя купальскія зёлкі: яе давалі выпіць хвораму; апырсквалі свойскую жывёлу; садовыя дрэвы, калі яны не давалі пладоў; поле перад сяўбою дзеля ўрадлівасці; новую хату перад засяленнем і гаспадарчыя пабудовы; пчальнікі і вуллі; труну перад тым, як пакласці ў яе нябожчыка, і выкапаны дол на могілках.

Найбольш уздзейнай лічылася вада, узятая з трох, а яшчэ лепей з сямі «Ярданяў», дзеля чаго пасылалі людзей у розныя месцы. Казалі, хто першы зачэрпне святой вады і вернецца дамоў, той першы збярэ з поля сваю збажыну. Разабраўшы ваду, неслі яе дадому, а потым паілі з палонкі коней. Смельчакі купаліся ў палонцы да ўсходу сонца, каб цела было бялейшае і каб



ачысціцца ад грахоў. Пры адсутнасці рэк ці азёраў бралі ваду з калодзежаў, апусціўшы туды крыжык, зроблены з лучыны, які потым вешалі на варотах ад ведзьмаў. Пяклі крыжыкі з цеста і елі іх. Напярэдадні Вадохрышча сяляне пераварочвалі вазкі і сані, бо ў гэты час нібыта павінны прыходзіць вадзянікі, каб за ўвесь наступны дзень, пакуль асвечаную ваду не знясе плынь, вывезці сваіх дзяцей, якія могуць загінуць ад апускання крыжа ў ваду. З асвечанай вады ўцякае і чорт, перасяляючыся на вярбу аж да яе асвячэння на Вербніцу.

На Вадохрышча ў некаторых месцах, у мінулым, рабіліся **агледзіны.** Прыбраныя дзяўчаты гулялі каля Ярдані або на беразе, а хлопцы выглядалі сабе нявест. Яшчэ сустракаўся такі звычай, калі на Водахрышча дзяўчаты з навакольных вёсак з'язджаліся ў вялікае сяло. Убор кожнай складаўся з некалькіх кашуль. Ніжняя была з двума чырвонымі палосамі, на яе апраналі яшчэ чатыры або пяць размалёваных кашуль, тры або чатыры фартуха, вышытых як кашулі. Зверху апранаўся кажушок. Пасля Ярдані дзяўчаты прыходзілі да царкоўнай агароджы, а адна з жанчын (абраная некалькімі жаніхамі) рассоўвала ім полы кажушкоў, паказвала фартухі, кашулі (да ніжняй з чырвонымі палосамі), а жаніхі судзілі аб уменні нявесты ткаць, шыць, вышываць, а таксама, і аб яе матэрыяльным забеспячэнні. *«Водахрышчэнскія змовіны – да шчаслівай сям'і»*, – казалі ў народзе.

На Вадохрышча дзяўчаты варожачы на суджанага, пералічвалі калы ў плоце («кол, каліца…»); з куццёю ў роце беглі на вуліцу і пыталіся ў першага стрэчнага імя. Існавала шмат прадказанняў будучага надвор'я і ўраджаю. На Вадохрышча звычайна прыпадалі самыя вялікія маразы, пасля якіх зіма паступова паварочвалася на лета. У народзе казалі: *«Трэшчы не трэшчы, прайшлі Вадахрэшчы – не к Ражству, а к Пятру»*, маўляў, больш маразоў ужо не будзе. Вадохрышча было днём, па якім арыентаваліся ў вызначэнні будучага надвор`я (*«На Вадохрышчы вельмі сцюдзёна – у жніво вельмі горача»*), спрабавалі прадказаць і якасць будучага ўраджаю (*«На Вадохрышча дзень цёплы – будзе хлеб цёмны»*). Народныя прыкметы не падманваюць і сёлета – пад Вадохрышча – прыйшлі адпаведныя маразы. Але сыходзіць нешта яны пакуль не збіраюцца :)

**Ульляна Полацкая**



**ВАРТАВЫЯ СЛУПЫ.**
**РАІСА БАРАВІКОВА.**

«Дам табе высокую пасаду –
Будзь майго бяссоння вартавым».

«Вунь слуп стаіць, як вартавы,
І… невядома што вартуе».

«Шапчу ледзь чутнае: «Да скорага»
І кожны слуп мне зараз родны.

З вершаў Раісы Баравіковай

Да стала я ўвечары прысяду –
Аніяк не спіцца, хоць раві.
Не прыходзіць атрымаць пасаду
Мой каханак: слуп і вартавы.

Дзіўнае такое спалучэнне,
Разабрацца цяжка з будуна.
А было ж, было вакол свячэнне –
Збегла варта, я цяпер адна.

Сігануў каханак агародамі.
Я шапчу: «Да скорага! Бывай!» –
Толькі слуп адзін застаўся родны:
Варта ці не варта? – вырашай.

***

Мае грахі, нібы агрэхі
На ніве прыкрага жыцця.
Не абыйсьці іх, не аб'ехаць –
А зь зельлем горкая куцця.
Хоць сьцеле мякка – жорстка спаць:
Мае грахі – ні даць, ні ўзяць.
Грахі мае – мае агрэхі,
Дзе распладзіў я столькі зла.
Дала мне доля на арэхі,
А рэшты так і не ўзяла.

***

Казала бабуля мне:
Зьліняе й чырвоны колер,
Здавалася не міне
Юнацтва маё ніколі.

Вучыла пасьля штодня:
Жыццё прыадкрытыя дзьверы…
Пацягне за ручку Судзьдзя –
Я ў словы яе ня верыў.

Мне думалася заўжды –
Вясною квітнець пачуцьцям.
Зьлічыла бабуля гады —
Цяпер толькі сэнс пачуўся.

Я сыну скажу пасьля:
Зьліняе й чырвоны колер!
Дарослае немаўля
Падумае, што ніколі…

## Анатоль Кудласевіч (Антон Кудлаты)

Пісьменнік, паэт, спявак. Нарадзіўся ў Столінскім раёне на Палессі ў 1961 годзе.

Скончыў Пінскі тэхнікум па спецыяльнасці ветэрынарыя, Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага (Масква). Набыў тузін спецыяльнасцей і змяніў дзесяткі месц працы. З 1990 г. жыве ў Мінску.

Арганізаваў і правёў сотні літаратурных сустрэч, вечароў паэзіі і літаратурных свят з удзелам беларускіх пісьменнікаў. Рыхтаваў і вёў аўтарскія праграмы на тэлебачанні і радыё.

Першая кніжка вершаў і пародый «Плакун-трава» выйшла ў 1993 годзе. Потым, у 1999 годзе, выйшаў зборнік вершаў «Зорныя ноты». Укладальнік «Анталогіі беларускай эпітафіі» і «Анталогіі беларускай пароды». Вершы і проза друкаваліся ў рэспубліканскіх выданнях, у Расіі і ва Ўкраіне. Спрабуе сілы ў драматургіі.

# НЕНУЖНАЯ СТАТИСТИКА

***Вот она – настоящая зима. Со снегом! Такой белый, такой пушистый и такой… вкусный. Неужели забыли вкус снега из детства? Только не говорите, что вы в детстве снег не ели! Это делали все. Во-первых, потому что мама запрещала, во-вторых, любопытство замучило. Итак, снег ели все.* ВОПРОС: ЗАЧЕМ ВЫ В ДЕТСТВЕ ЕЛИ СНЕГ?**




1 – Чтобы заболеть

2 – Только маме не говорите

3 – Все ели и я ел

4 – Чтобы весна быстрее пришла

**И**нтересно, какой процент детей заболевал после того, как наедались снега? А может снега съедали маловато и не заболевали? Усердней надо быть!:)

Группа малышей сосредоточенно поедает ближайший снег – так проводили зимы в детстве 15 % опрошенных студентов.

Может уже пора собрать вместе 27 % пгу-шных студентов, уверенных в младшем возрасте в том, что, если есть снег, весна придет быстрей? А то как-то слишком уж холодно на улице стало. Весну бы уже поскорей.

Не волнуйтесь насчет мам: наши статисты не проболтаются!

# СУМНА?

– Я у вас кампутар набыў… Дык ён здох!
– Гарантыя якая?
– Пажыццёвая!
– Калі здох – гарантыя скончылася…

***

– Як справы ў Каляна?
– Папаўся ён на хабары – 5 гадоў далі…
– Ды ты што?! Толькі ж па-чалавечаму жыць пачаў!
– Так, дзіцяці 2 гады!
– А дзіцяці-та за што?!

***

– Якая розніца паміж жанчынамі і батарэйкамі?
– У батарэек ёсць плюсы…

**Наклад: 299 ас.**
**бясплатна**

Заснавана ў 2004 годзе. Выдаецца на правах рукапісу.
Думкі аўтараў могуць не супадаць з нашым уласным меркаваньнем.
Матэрыялы падаюцца на мове аўтараў.
**Харошыя людзі:** М.Азарова, Н.Сарокіна, В.Лобаў, В.Сублім.
**www.makasin.info** | **e-mail:** hazeta@gmail.com |
Надрукавана на асабістым абсталяваньні